Камплементарная ацэнка ініцыятыў П. Мінкова па стварэнні ці напаўненні экспанатамі прыродазнаўчага музея ў Гарадзенскай губерні, несумненна, дапушчальная, калі сапраўдным яго матывам быў клопат пра навуку, захаванне прыроднай спадчыны і пашырэнне сельскагаспадарчых ведаў. Пэўныя сумненні ў гэтым выклікае жаданне П. Мінкова прадставіць дзейнасць па фармаванні музея не толькі як вынік яго асабістых высокіх памкненняў, але і як інспірацыю з боку кіраўніцтва губерні. Фінальная частка звароту П. Мінкова ўвогуле прагучала нетыпова для тагачаснага кіраўніка: ён падкрэслена дэклараваў нежаданне ўзвышацца над сваімі падначаленымі, нават прапаноўваў лічыць сябе проста *“старэйшым па калегіі таварышам”,* а *“не проста “Губернскім Аграномам”*. Не зразумела, чым была выклікана такая чыноўніцкая лірыка, але яна відавочна сведчыла пра спецыфіку атмасферы адносін, якія імкнуўся культываваць у падначаленай яму структуры губеранскі агроном П. Мінкоў [1, арк. 42 адв.].

Па ўсёй верагоднасці, ініцыятыва губернскага агранома па стварэнні прыродазнаўчага музея ў Гародні сапраўды мела свой працяг. Прынамсі, пра гэта сведчаць звесткі пра існаванне ў 1915 г. у доме Ястржэмбскага ў раёне сучаснай плошчы Тызенгаўза “сельскагаспадарчага музея ўрадавай агранамічнай арганізацыі” [2, с. 350]. Не выключана, што гэта менавіта тая ўстанова, якую так жадаў убачыць у Гародні Павел Мінкоў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ. Ф. 868. В.1. Спр.6.
2. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. Гародня-Warszawa, 2012.

УДК 357. 23 (091) “1911/1912” (476.76)

## СПРОБА СТВАРЭННЯ ПЕРШАГА АГРАНАМІЧНАГА ВЫДАННЯ Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Калі сыходзіць з захаваных архіўных матэрыялаў, Гарадзенская асаблівая агранамічная нарада (далей – ГААН) пачала сваю дзейнасць у 1910 г. і адразу стала важным інструментам рэалізацыі дзяржаўнай сельскагаспадарчай палітыкі. Дзейнасць ГААН мела рэгулярны характар, што даволі добра адлюстравана ў пратакольных журналах, якія вяліся на яе пасяджэннях. Аўтарытэт апошніх быў гарантаваны прысутнасцю і старшынствам губернатара, удзелам віцэ-губернатара



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

(разам з губернатарам альбо замест яго), а таксама кіраўніцтва розных устаноў (прадстаўнікоў управы землябства і дзяржуласнасці, мясцовага аддзела сялянскага банка, губернскага праўлення, землеўладкавальнай камісіі, гарадзенскага акруговага суда, дваранскага самакіравання). Абавязак прысутнічаць на нарадах распаўсюджваўся на мясцовых аграномаў, якія знаходзіліся на дзяржслужбе: губернскага і ўрадавага аграномаў, старэйшага спецыяліта па садаводстве, а таксама шэраговых службоўцаў-аграномаў. Колькасць удзельнікаў ГААН звычайна вагалася ў межах двух-трох дзясяткаў асоб.

Спектр праблем, якія абмяркоўваўліся падчас агранамічных нарад, быў вельмі шырокі, у тым ліку адбываліся прэзентацыі лакальных ініцыятыў, якія, у сваю чаргу, былі рэакцыяй на выклікі дзяржаўнай палітыкі ў галіне паляпшэння сельскай гаспадаркі. Падобны выпадак быў зафіксаваны ў пратакольным журнале ГААН па выніках пасяджэння ад 31 траўня 1912 г. Важнасць гэтага мерапрыемства падкрэслівалася прысутнасцю як губернатара В. М. Барзенкі, так і яго намесніка. Адметна, што з 23 удзельнікаў толькі адзіннаццаць былі ўласна аграномамі па прафесіі і пасадах. Такая дыспрапорцыя дадала вастрыні выразнаму палітычнаму зместу аднаго з пунктаў, якія абмяркоўвалі ў ГААН у той дзень [1, арк. 33].

У шэрагу пытанняў, што былі вынесеныя на парадак дня, апынуўся леташні даклад спецыяліста па садаводстве П. Катовіча, які 8 чэрвеня 1911 г. прадставіў нарадзе свае развагі адносна неабходнасці выдання ў Гарадзенскай губерні сельскагаспадарчага часопіса. Дакладчык аўтарытэтна сцвярджаў, што ў шэрагу перашкод *“для распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў сярод сялянскіх мас Гарадзенскай губерні варта назваць адсутнасць у губерні адпаведных органаў перыядычнага друку ўвогуле і сельскагаспадарчых часопісаў у прыватнасці”*. П. Катовіч канстатаваў кур’ёзную сітуацыю: адзіным губернскім выданнем, якое давала магчымасць для размяшчэння нататак па сельскай гаспадарцы, з’яўляліся “Гарадзенскія епархіальныя ведамасці”, якія раз на два тыдні друкавалі так званую неафіцыйную частку. Але распаўсюджванне гэтага дадатку насіла абмежаваны характар, а самі нататкі па пытаннях сельскай гаспадаркі, як адзначалася ў дакладзе: *“маюць выключна выпадковы характар”*. Далей П. Катовіч паведамляў, што сыходзячы з *“мясцовых умоў”*, не прыходзіцца чакаць з’яўлення прыватнай ініцыятывы па выданні “*для карэннага рускага насельніцтва Гарадзенскай губерні рускага ж сельскагаспадарчага часопіса”*. За гэтай эўфемічнай фразай П. Катовіч хаваў пераважна праваслаўных беларусаў, якія афіцыйнай царскай прапагандай лічыліся часткай рускага народа. Але нежаданне займацца друкам на расійскай

мове не азначала, па меркаванні П. Катовіча, што ў губерні не было цікавасці да сельскагаспадарчай перыёдыкі. Больш таго, ён сцвярджаў, што *“усе мясцовыя грамадскія сілы, такія як буйныя сельскагаспадарчыя таварыствы, падпарадкаваныя ім вопытныя і іншыя ўстановы, дзейнасць якіх субсідзіруецца Дэпартаментам Земляробства, таксама як і ўсе мясцовыя прадстаўнікі буйнога землеўладання хутчэй схільныя да падтрымання польскіх часопісаў”*. Для пацвярджэння гэтага ён нават прывеў “абуральны” прыклад, а менавіта, публікацыю на старонках адной з Віленскіх газет аб’явы аб з’яўленні *“першага польскага сельскагаспадарчага часопіса “Tygodnik rolniczy”* (Сельскагаспадарчы штогоднік), мэтай якога было *“абслугоўванне шасці літоўска-беларускіх губерняў”*. Аднак вялікага прамога эфекту ад гэтага перыёдыка П. Катовіч не чакаў, паколькі выданне было *“органам польскага друку”*, а таму, і ў гэтым дакладчык не сумняваўся, яно *“пройдзе міма бальшасці рускага насельніцтва Гарадзенскай губерні”* [1, арк. 33]. Тут варта адзначыць, што згаданае польскамоўнае выданне не толькі было прэзентавана, але і паспяхова выдавалася ў Вільні з 1911 г. па 1915 г. пад рэдакцыяй А. Нарбута [2]. Больш таго, у яго загалоўку сапраўды спецыяльна акцэнтвалася ўвага на інтарэсах лакальнага з *“Літвы і Белай Русі”* чытача, які цікавіўся сельскагаспадарчай тэматыкай.

Фактычна, калі сыходзіць з логікі П. Катовіча, сітуацыя на Гарадзеншчыне выглядала даволі тупіковай, паколькі мясцовых выданняў на расійскай мове не было, а польскамоўныя, па яго адзнаках, мелі абмежаваную аўдыторыю. Між тым з даклада вынікала, што паступовы пераход сялян да больш *“рацыянальных спосабаў землекарыстання”* выклікаў інфармацыйны голад, у выніку якога *“хутаране ўсё з большай і большай сквапнасцю накідваюцца на ўсякую патрапіўшую да іх кніжку ці брашурку”*. П. Катовіч быў упэўнены, што сельскагаспадарчы перыёдык мог стаць *“самай даступнай, цікавай і ў той жа час таннай формай крыніцы сельскагаспадарчых ведаў”*. Сваё перакананне ў магчымасцях мясцовымі сіламі выдаваць часопіс П. Катовіч падмацоўваў наяўнасцю ў губерні “цэлага кадру [так у арыгінале] агранамічнага персаналу”, які складаўся з в. а. урадавага агранома, спецыяліста па садаводству, дзевяці аграномаў з вышэйшай адукацыяй з ліку службоўцаў землеўладкавальных камісій, памочнікаў аграномаў з сярэдняй адукацыяй і шматгадовым досведам працы і г. д. [1, арк. 33 адв.].

У выніку прысутныя 8 чэрвеня 1911 г. на агранамічнай нарадзе адзначылі “*аграмадную*” значнасць узнятага пытання, прычым як “*у культурных, так і ў палітычных адносінах*”, і прынялі рашэнне

звярнуцца з хадайніцтвам да Дэпартамента Земляробства (ДЗ) аб выдачы паловы неабходнай на выданне сумы (2525 рублёў), а іншую частку сродкаў меркавалі атрымаць ад Гарадзенскага Губернскага Распарадчага Камітэта (ГГРК). Відавочных вынікаў ад гэтай пастановы не было, пра што сведчыць вяртанне праз год да справы аб часопісе, ідэя выдання якога не была адкінута, больш таго, была даведзена да кіраўніцтва ДЗ [1, арк. 34].

Варта таксама адзначыць, што ініцыятыва П. Катовіча ўзнікла ва ўмовах даволі багатага і даступнага мясцовым аграномам асартыменту сельскагаспадарчых перыядычных выданняў, якія выдаваліся ў Расіі на пачатку XX ст. Захаваўся ілюстратыўны рахунак-фактура з гарадзенскай крамы, якая займалася продажам кніг і паперы "*М. Я. Зморской и К*[о]" (знаходзілася па адрасе: Мураўёўская вуліца, дом Таварыства ўзаемнага крэдыту), дзе дадзены звесткі пра выданні, якія ў 1914 г. замаўляліся для сельскагаспадарчых аддзелаў Гарадзенскай землеўладкавальнай камісіі. Так, губернскі агранам П. Мінкоў атрымліваў часопісы "Сельскохозяйственная жизнь", "Опытный агроном", "Рациональное удобрение", "Молочное хозяйство", "Животноводство", "Известия московской сельскохозяйственной школы". На Слонімскі філіял былі выпісаны "Сельское хозяйство", "Садоводство, огородничество и плодоводство", "Вестник сельского хозяйства", "Сельскохозяйственная жизнь". Акрамя пералічаных выданняў, у Кобрын і Беласток быў выпісаны часопіс "*Прогрессивное садоводство*" [3, арк. 146-147].

Так ці іначай, але да 31 траўня наступнага 1912 года да ГААН дайшлі звесткі пра тое, што ДЗ пагадзіўся ўнесці 2525 рублёў на выданне сельскагаспадарчага часопіса ў Гарадзенскай губерні ў каштарыс на 1913 г. Менавіта гэта інфармацыя стала падставай для актуалізацыі "праекта Катовіча" і, нарэшце, каталізатарам з'яўлення пастановы ГААН ад 31 траўня 1912 г. з просьбай да ГГРК вылучыць другую частку грошай – таксама 2525 рублёў [1, арк. 34]. Такім чынам, агульна на выданне павінна было пайсці 5050 рублёў.

Адметна, што ні незадаволенасць наяўнасцю канкурэнтаў, ні прафесійны абавязак ніяк не зрушылі пытанне з часопісам на працягу года. Даволі вялікая карпарацыя аграномаў не змагла самастойна нічога ініцыяваць, акрамя просьбы даць грошы. У чаканні на дзяржаўную падтрымку мінуў год, а калі ў 1912 г. з'явілася надзея атрымаць неабходныя сродкі, то ўжо сам тэрмін ад праекта да яго рэалізацыі небяспечна зацягваўся. Але чаканні ГААН, па ўсёй верагоднасці, не спраўдзіліся. Восеньскія аптымістычныя планы арганізацыі былі зрэзаны цыркулярам ГУЗіЗ ад 6 кастрычніка 1912 г. (№ 179), згодна з



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

якім пачатковы каштарыс выдаткаў на агранамічную дапамогу ў губерні, запланаваны ў памеры 104 938 руб., належала скараціць да 85 000 рублёў [1, арк. 35]. Характэрна, што ў пераліку скарочаных пунктаў не было сумы на сельскагаспадарчы часопіс, ад выдання якога, відаць, прыйшлося адмовіцца раней [1, арк. 35-35 адв.]. На жаль, наяўныя на сённяшні час звесткі не дазваляюць нам сцвярджаць, што перыёдык, прынамсі, яго рукапісная версія, быў падрыхтаваны. Не вядома і назва запланаванага П. Катовічам выдання. Аднак заслугоўвае ўвагі і павагі сама ідэя стварэння профільнага лакальнага агранамічнага выдання як аднаго з элементаў сістэмы мерапрыемстваў па развіцці сельскагаспадарчай культуры Гарадзеншчыны. Вельмі важна, што захавалася імя аўтара гэтай ідэі, якая належыць да ліку найлепшых асветніцкіх ініцыятыў ГААН.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гродна. Ф. 868. В. 1. Спр. 3.
2. www/vle.lt/straipsnis/tygodnik-rolniczy/.
3. НГАБ у Гродна. Ф. 868. В. 2. Спр. 7.

УДК 81’373.21

## ГИДРОНИМЫ В БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИХ ЛЕТОПИСЯХ

**Голубович О. П.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Источниковой основой данного исследования послужили тексты памятников белорусско-литовского летописания, опубликованные в 1975-1980 гг. [1, 2]. Топонимы отапеллятивного происхождения составляют 15,9 % общего количества географических названий, использованных в анализируемых текстах; среди них довольно репрезентативно представлены гидронимы, что мы можем проиллюстрировать на следующем материале.

Название *Буг, Бугь, над Бугом, Бугу, Вuhu, Бог* в белорусско-литовских летописях употребляется для обозначения двух рек – *Западного Буга и Южного Буга*. Это название не имеет однозначной этимологии; кроме того, некоторые исследователи сомневаются в общности происхождения названий *Западного Буга и Южного Буга*. Одно из объяснений связывает имя *Южного Буга* с русским словом *бег* «течение» и немецким *Bach* «ручей»; возможны объяснения из иранских языков [3].

Происхождение гидронима *през Буг, на устю Бугу phки, k rece Вuhu, о phку Бугь, об реку Буг, об реку Бог* предполагается от



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ